we Lwowie budowniczych włoskich / Tadeusz Mańkowski. // Księga pamiątkowa ku czci Leona Pinińskiego. — Lwów: Ossolineum, 1936. — T. II. — S. 136.

**SUMMARY**
**Ewa Korpysz,**
**Krzysztof Korpysz**
Renaissance tabernacles in Lesser Poland (Małopolska) and the Lvov area
Among the examples of 16th century sculpture in Lesser Poland (Małopolska) and the Lvov area the tabernacles in Gdów, Wiśnicz and Dobromil are of particular interest. They are in form of aedicula with tympanum leaned on pilasters. The

***Святлана БЯЛЯЕВА***

# ЗААМОРФНЫЯ МАТЫВЫ Ў АРХІТЭКТУРНЫМ ДЭКОРЫ НАРОДНАГА ЖЫЛЛЯ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ

У доповіді розглянуто тератологічні, зооморфні та орнітологічні мотиви в архітектурному декорі білоруського народного житла, досліджується їхня семантика, простежується зв'язок з народними повір'ями.
*Ключові слова: тератологічні мотиви, зооморфні мотиви, зображення змій та вужів, зображення драконів, антитетична композиція, орнітоморфні мотиви.*

У нашым допаведзе мы звяртаемся галоўным чынам да заморфных і тэраталагічных выяў. Падобныя выявы маюць карані ў глыбокай старажытнасці і вядуць адлік часу з наскальнага жывапісу. Да гэтага ж перыяду адносяцца малюнкі змей і вужоў. Выявы драконаў і грыфонаў у якасці "абаронцаў" уваходзілі ў афармленне храмаў і жытлаў старажытнай Русі[1]. Апатрапейныя знакі на беларускіх хатах дайшлі да нашых часоў, але іх значэнне амаль страчана, па большай частцы выявы ўспрымаюцца з эстэтычнага пункту гледжання. Размяшчаюцца заморфныя і тэраталагічныя выявы на фрызах і каронах аконных ліштваў, на франтонах хат сустракаюцца эпізадычна і адносяцца да больш позніх часоў, аднак найбольш старажытным упрыгожаннем жытла з'яўляецца вільчык. На трыпольскіх керамічных мадэлях ён рабіўся ў выглядзе рогаў быка[2]. Да нашых часоў дайшлі нарвежскія стаўкіркі XII

стагоддзя з драконамі на вільчыках. Парныя вільчыкі былі распаўсюджаны ў Беларусі, Прыбалтыцы, Польшчы, Славакіі, Венгрыі, Харваціі, Швецыі, Нарвегіі, Швейцарыі і Галандыі[3], на тэрыторыі Расіі бытавалі ў Яраслаўскай, Кастрамской, часткова Ніжнегародскай губернiях.

На беларускім Палессі бытавала традыцыя выразаць на вільчыках дзве змяі, павёрнутыя галовамі ў процілеглыя бакі, ці галовы буслоў[4], часта сустракаліся падвоеныя галовы коней або рогі. Як сведчаць даследчыкі, такія вільчыкі бытавалі ўздоўж межаў Цэнтральнай Беларусі і Палесся, а таксама ўздоўж мяжы Панямоння, арэал бытавання пашыраўся на поўнач (поўдзень Карэліцкага, Стаўбцоўскі, Уздзенскі, Пухавіцкі, Старадарожскі раёны)[5]. Адзінкавыя прыклады аздаблення хат падвоенымі вільчыкамі захаваліся да нашых дзен, напрыклад, у в. Філіпавічы Капыльскага раёна, в Забалацце Уздзенскага раёна і інш.

Выявы змей і вужоў, г. зн. тэраталагічныя выявы, размяшчаліся на вільчыках беларускіх хат невыпадкова. Змяя ў сусветных міфалогіях звязваецца з урадлівасцю, зямлёй, вадой, дажджом, жаночай сілай, а таксама з агнём і мужчынскім пачаткам[6]. Па беларускіх павер’ях, дамавы ўяўляўся ў выглядзе змяі і па паходжанню лічыўся амаль што не змяёй[7]. Дамавы вуж называўся гаспадаром, дамавіком, хатнікам, сялібнікам, вужом-вартаўніком[8]. Трэба ўлічваць, што ў некаторых мясцовасцях вужамі называлі і вужоў, і гадзюк[9]. У ваколіцах Кобрына забойства чорнага вужа да нашага часу лічыцца грахом. Выявы вужоў на вільчыку павінны былі абараняць хату ад удару маланкі[10].

У аздабленні аконных ліштваў тэраталагічныя выявы сустракаюцца не вельмі часта. Як сведчаць даследчыкі, на Палессі выразалі ці малявалі на ліштвах вужоў і гадзюк, размяшчаючы галавой адзін да аднаго. Пры гэтым лічылася, што гадзюка валодае большай ахоўнай сілай, абараняючы хату ад удару маланкі і пажару, таму абавязкова паказвалася з каронай. Вужы абаранялі гаспадароў хаты ад гора, захоўвалі дабрабыт. У той жа час вуж часта выразаўся на вакне, бліжэйшага да печы, “каб агонь не згас і быў дастатак”[11].

У Чэрвенскім раёне Мінскай вобласці распаўсюджаны кароны ліштваў у выглядзе дзвюх валютападобных завіткоў, якія заканчваюцца вужынымі ці змяінымі галоўкамі (часам тэраталагічны матыў набывае рысы антрапаморфнага)[12]. Месцамі “вужыныя”



в. Горкі Чэрвенская р-на Мынскай вобл.



г.Червень Мінская вобл., вул. Мінская, д.7



в. Загур'я Несвіжскага р-на Мінскай вобл.



г. Едлін Пухавічскагара р-на Мінскай вобл.



в. Я. Слабада Клічаўскага р-на Мінскай вобл.



в. Цімкавічы Капыльскага р-на Мінскай вобл.

выявы ўспрымаюцца як арнітаморфныя, што падкрэсліваецца афарбоўкай ліштваў, часам нават трансфармуюцца ў зааморфныя (в. Новая Ніва Чэрвенскага раёна).

У г. Чэрвені на аконных ліштвах дамоў пачатку XX стагоддзя па вул. Мінскай, дд. 6, 7 зафіксаваны выявы драконаў. Пры гэтым у адным выпадку драконы размяшчаюцца абапал стылізаванай расліны галовамі адна да другой, у другім — галовы пачвар павёрнуты ў процілеглыя бакі. Падобная антытэтычная кампазіцыя зафіксавана і ў в. Перасады Барысаўскага раёна Мінскай вобласці. У в. Затур'я Несвіжскага раёна Мінскай вобласці можна ўбачыць выявы грыфонаў на грабяні ваконнай ліштвы. Думаецца, што падобныя аздабленні раней выкарыстоўваліся больш шырока, але дамоў даваеннага часу захавалася няш-

мат, і мы можам фіксаваць толькі адзінкавыя прыклады такога дэкору.

У в. Залессе Пухавіцкага раёна Мінскай вобласці карона ліштваў зроблена ў выглядзе дзвюх птушак. Незвычайна выразаны галовы істот: па-першае, яны адвернуты адна ад другой, што сустракаецца рэдка, па-другое, раскрытыя дзюбы з высунутым языком не ўпісваюцца ў іканаграфію арнітаморфных выяў. Цікава, што ў балгарскіх, сербскіх і рускіх рукапісах XI–XIII ст. сустракаюцца выявы пачвар з тулавам птушкі, але з мордай тэраталагічнага выгляду[13]. С. Б. Раждзественская прыводзіць прыклады разьбы з выявамі драконаў, адмячаючы ўстойлівую кампазіцыю — два драконы, якія цягнуцца адзін да аднаго, з павёрнутымі ў розныя бакі галовамі, — і тое, што адной з характэрных рыс драконаў з'яўляецца высунуты з пашчы язык[14]. С. І. Лічэнка адмячае распаўсюджанасць вышэйазначанай кампазіцыі з драконамі і ў калужскай разьбе[15]. Беларускія даследчыкі таксама фіксуюць пераважна такое размяшчэнне пачвар у дамавым дэкоры[16]. Такім чынам, можна выказаць думку, што ў абрысах на ліштве з в. Залессе спалучаюцца рысы птушкі і дракона.

Зааморфныя выявы ў архітэктурным дэкоры народнага жылля сустракаюцца параўнальна рэдка, пры гэтым звяры могуць быць як павёрнуты адзін да аднаго, так і глядзець у розныя бакі; існуюць варыянты, калі пры гэтым тулавы істот накіраваны да цэнтра ліштвы. Прыцягвае ўвагу вялікая разнастайнасць выяў. Так, на ліштве з в. Веляцін Хойніцкага раёна Гомельскай вобласці мы бачым нейкіх водных жывёл (цюленей?)[17], што падкрэсліваецца зігзагам у ніжняй частцы выявы. У в. Вялікія Бялевічы Магілёўскага раёна звяркі на кароне ліштваў больш за ўсё нагадваюць мышэй. Часам цэнтрам кампазіцыі становіцца Сусветнае дрэва. У якасці прыклада прывядзем малюнак ліштваў з кампазіцыяй, змешчанай ў трохкутнік надваконнай часткі ліштвы (в. Едлін Пухавічскага раёна Мінскай вобласці). Кампазіцыя антытэтычная — абапал стылізаванага дрэва стаяць двое звяроў з галовамі, павярнутымі назад. У вв. Я. Слабада Клічаўскага раёна Магілёўскай вобласці і Гарадзішча Магілёўскага раёна Магілёўскай вобласці. зафіксаваны амаль ідэнтычныя выявы вавёрак на ліштвах, але кампазіцыйнае рашэнне гэтых сюжэтаў рознае. У першым выпадку гэта парная антытэтычная выява, дзе звяркі сядзяць супроць адзін аднаго з шышкамі ў лапках і заключаны ў сумешчаныя кругі-прарэзкі, у другім — выявы вавёрак размяшчаюцца па адной у крузе па цэнтры ліштвы кожнага вакна, пры гэтым звяркі на суседніх ліштвах "глядзяць" адзін на аднаго. Падобнае вырашэнне аздаблення разной кароны мы сустрэлі і ў г. Гомелі па вул. Цыялкоўскага, д. 27. Кругі, у якіх змешчаны вавёркі, ствараюцца валютападобнымі раслiннымі атожылкамі і знаходзяцца па баках ад "куста"-разеткі. Як бачым, тут прасочваецца

агульная кампазіцыйная схема, тым больш, што аб'ядноўваючай рысай з'яўляюцца шышкі ў лапках вавёрак. У г. Капыль Мінскай вобласці аздабленне франтона хаты дапоўнена трохфігурнай кампазіцыяй з вавёркамі. Бакавыя выявы месяцца абапал цэнтральнага стылізаванага каласка-цягі, на карнізе франтоннага вакенца. Пры гэтым цэнтральная фігурка, замацаваная паверх каласка, меншая за бакавыя і павёрнута ў левы бок, што нетыпова для такога роду кампазіцый і дае падставу сцвярджаць, што аздоба франтона хаты была дапоўнена пазней. У в. Чарнаградзь Чэрвенскага раёна Мінскай вобласці вавёркі месяцца на шалёўцы вуглоў дома.

У наш час дамавы дэкор набывае большую разнастайнасць дзякуючы выкарыстанню альбомаў з рознымі тыпамі узораў і замалёвак, відарысы жывёл страчваюць стылізацыю, майстрамі, як правіла, надаецца большая ўвага дэталям выяў і яны набываюць больш канкрэтныя рысы. Напрыклад, у в. Цімкавічы Капыльскага раёна на франтоне адной з хат, на гарызантальнай цяге над франтонным акенцам, змешчана разная выява двух бягучых насустрач адзін аднаму аленяў абапал стылізаванай зоркі. Падобнае аздабленне знаходзіцца і над уваходам у хату, але там алені стаяць насупраць адзін аднаго. У в. Дабрасневічы Магілёўскага раёна ніжнюю частку франтона займаюць бягучыя насустрач ласі, але галовы жывёл павёрнуты назад; у верхняй частцы франтоннае вакенца вянчае вялікая шматпялёсткавая салярная разетка.

У г. Добруш Гомельскай вобласці, на доме па вул. Паскевіча, 97, прыцягвае ўвагу нетрадыцыйная кампазіцыйная схема дэкору: цэнтрам з'яўляецца вакно пасярэдзіне фасада, аздабленне якога ілюструе басню "Ліса і вінаград" — "завушніцы" ліштвы выразаны ў выглядзе гронак вінаграда, да якіх знізу бакавых планак падбіраюцца дзве лісы. Атачэннем служаць два вакны, дзе ў малюнак разных ліштваў уключаны выявы аленяў з павёрнутымі ў розныя бакі галовамі. На фрызавай дошцы бакавых варот можна ўбачыць разную ілюстрацыю да казкі "Ліса і воўк".

Позірк сучаснага майстра прыцягнулі нават aслікі, дзве выявы якіх размясціліся па ніжняму краю закрылін дома па вул. Дзяржынскага, 20. Па словах гаспадыні, Лізун Вольгі Іосіфаўны, разьбу рабілі муж дачкі Галай Мікалай Сяргеевіч і сын Мікалай Мікалаевіч. Незвычайнае ўбранства дома дапаўняецца традыцыйным відарысам птушак на ваконных ліштвах.

Арнітаморфныя выявы, бадай, найбольш распаўсюджаныя сярод вышэйазначаных. Па большай частцы гэта парна-сіметрычныя кампазіцыі, прычым абрысы птушак, як правіла, лёгка пазнаюцца. Выконваюцца яны, часцей за ўсё, ў т. з. "плакатным" стылі. Пры гэтым выявы найчасцей павёрнуты да цэнтра, але сустракаюцца варыянты, калі птушкі павёрнуты

ў розныя бакі. Варыянт, калі птушыныя выявы павёрнуты адна да адной тулавамі, а галовы глядзяць у розныя бакі, ужо разглядаўся вышэй. Да іншага тыпу адносіцца выява птушкі з раскрытымі крыламі. Арнітаморфныя выявы, як і папярэднеразгледжаныя, дайшлі да нас з глыбіні вякоў, іх семантыка даволі складаная і патрабуе асобнага даследвання.

Як мы бачым, тэраталагічныя і зааморфныя выявы, якія маюць старажытныя карані, працягваюць сваё існаванне ў архітэктурным дэкоры народнага жылля ў наш час, захоўваючы традыцыйны вобразна-сюжэтны і кампазіцыйны строй. Разам з тым у разьбяных аздабленняхназіраецца выкарыстанне новых матываў і пошук іншых кампазіцыйных рашэнняў, што сведчыць аб змяненні традыцый.

---

1. Вагнер Г. К. Декоративное искусство в архитектуре Руси X–XIII вв. — М.: Наука, 1964. — С. 7.
2. Бурдо Н. Сакральний світ трипільської цивілізації. — К.: Наш час, 2008. — С. 205–211.
3. Чижикова Л. Н. Архитектурные украшения русского крестьянского жилища // Русские. Историко-этнографический атлас. Из истории русского народного жилища и костюма (середина XIX — начало XX в. ) / Л. Н. Чижикова [и др.]; Под ред. В. А. Александрова, П. И. Кушнера, М. Г. Рабиновича. — М., 1970. — С. 28.
4. Сахута Я. М. Народная разьба па дрэву. — Мінск: Вышэйшая школа, 1978. — С. 8.
5. Архітэктура Беларусі: нарысы эвалюцыі ва ўсходнеславянскім і еўрапейскім кантэксце: У 4 т. — Т. 4, кн.1. Беларускае народнае дойлідства / А. І. Лакотка; навук. рэд. А. І. Лакотка. — Мінск: Беларуская навука, 2008. — С. 215–216.
6. Иванов В. В. Змей // Мифы народов мира: Энциклопедия: В 2 т. / Гл. ред. С. А. Токарев. — М.: Советская энциклопедия, 1987. — Т. 1. — С. 468–471.
7. Демидович П. Из области верований и сказаний белорусов // Этнографическое обозрение. — 1896. — № 1. — С. 118.
8. Ненадавец А. М. Ніжэйшая міфалогія беларусаў / А. М. Ненадавец, А. У. Марозаў, Л. М. Салавей, Т. А. Івахненка // Міфалогія. Духоўныя вершы / Навук. рэд. А. С. Фядоск. — Мінск, 2003. — С. 242.
9. Салавей Л. М. Вуж // Беларускі фальклор: Энцыклапедыя: У 2 т. / Рэдкал.: Г. П. Пашкоў і інш. — Мінск: БелЭн, 2005. — Т. 1. — С. 278.
10. Ненадавец А. М. Узгаданае сачыненне. — С. 241–242.
11. Ненадавец А. М. Каму пакланяліся продкі / Навук. рэд. А. С. Фядосік. — Мінск: Навука і тэхніка, 1996. — С. 146, 193–194.
12. Бяляева С.Раслінна-антрапаморфныя выявы ў дэкоры аконных ліштваў на тэрыторыі Беларусі // Історія релігій в Україні: Науковий щорічник. — Кн. 1. — Львів, 2009. — С. 44–45.
13. Киселев Н. А. Из опыта классификации тератологических композиций в памятниках южнославянской и русской письменности XI–XIII вв. // Карпато-Дунайские земли в средние века: Сб. ст. / Изд-во "Штиинца"; Отв. ред. Я. С. Гросул. — Кишинев, 1975. — С. 332.

14. Рождественская С. Б. Русская народная художественная традиция в современном обществе. Архитектурный декор и художественные промыслы. — М.: Наука, 1981. — С. 65.
15. Личенко С. И. Калужская архитектурная пропильная резьба // Народное искусство Калужского края XIX–XX веков: архитектурная деревянная резьба, вышивка, кружево, игрушка: Очерки. — Калуга, 2001. — С. 20.
16. Сахута Я. М. Узгаданае сачыненне, фота 12; Беларуская народная архітэктурная разьба: Альбом / Склад. і аўтар уступ, арт. канд. гіст. навук Л. А. Малчанава. — Мн.: Дзяржаўнае выдавецтва БССР, 1958. — Мал. 274.
17. Беларуская народная архітэктурная разьба…, мал. 125.

**SUMMARY**

**S. Bialiaeva**

**ZOOMORPHIC MOTIVES IN AN ARCHITECTURAL DECOR OF THE BELARUS NATIONAL HABITATION**

In the report are considered teratological, zoomorphic and ornithological motives in an architectural decor of the Belarus national habitation, their semantics is considered, communication with national popular beliefs is traced.
Keywords: teratological motives, zoomorphic motives, ornithological motives, architectural décor.

***Олена Бакович***

# АНСАМБЛЕВІСТЬ У МИСТЕЦЬКОМУ ОБЛАШТУВАННІ ХРАМУ СВ. ВЕЛИКОМУЧЕНИКА ДИМИТРІЯ У СЕЛІ РЕМЕЗІВЦІ НА ЗОЛОЧІВЩИНІ

Розглянуто особливості структури та змістового наповнення мистецького облаштування храму у с. Ремезівці у контексті храмів Західного Поділля другої половини XVIII ст., виконаних у стилі рококо; досліджені характерні риси та особливості.
*Ключові слова: апсида, бароко, вівтар, дияконські врата, іконостас, картуш, пластика, рокайль, рококо, стиль, царські врата, фасад.*

Українське сакральне мистецтво активно почало розвиватись ще з приходом християнства на українські землі. Жодна культура та мистецтво не можуть розвиватись у повній ізоляції від світу, і українське сакральне мистецтво у процесі свого розвитку, не втрачаючи своєї національної основи,